

# Іван Осіпаў

магістр эканамічных навук, прадстаўнік новага пакалення бортнікаў у Беларусі, які пераймае традыцыю ад яе носьбітаў. У 2017–2020 гадах прымаў удзел у падрыхтоўцы намінацыйных форм для ўключэння традыцый бортніцтва ў Нацыянальны Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны, а таксама ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва (ЮНЭСКА). Узнагароджаны дыпломам Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЭСКА і дыпломамі фіналіста конкурса «Спадчыны ў дзеянні» (2019 і 2021 год).

Фота Івана Осіпава

# Беларускае лясное бортніцтва: старая традыцыя ў святле сучасных сацыяльных і экалагічных канцэпцый культурнай спадчыны

## Belarusian Forest Beekeeping: an Old Tradition in the Light of Modern Social and Environmental Concepts of Cultural Heritage

**Іван Осіпаў**

**The article by Ivan Osipau, a custodian of the tradition of forest beekeeping and co-author of the nomination dossier for this cultural heritage element to be included in UNESCO's List of Intangible Cultural Heritage, is dedicated to the understanding of this millennia-old tradition. It explores its journey from being a vital livelihood for rural communities, through a period of industrial exploitation and gradual decline, to its renewed recognition as an important element of national culture. The tradition has constantly evolved and now fits perfectly into the new trends of eco-friendly food, contributes to the maintenance of sustainable forest ecosystems, and serves as an excellent example of community-oriented approach in heritage sector.**

Бортніцтва – гэта культурная форма пчалярства, якая ўключае дагляд і ахову пчол у натуральных для іх умовах існавання (нарутальныя лясныя, балотныя і лугавыя біятопы) у прыстасаваных борцях-дуплах і калодах-вуллях. Гэта традыцыйны промысел, які базуецца на глыбокім культурным кантэксце, звязаным з ведамі пра навакольны свет, звычаёвым правам, матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурай, абрадамі і традыцыямі, народнай кухняй, медыцынай і іншымі.

А яшчэ бортніцтва – гэта інтымная філасофія і агульнае ўсведамленне сусветнага парадку. Бортніцтва выступае складанай старадаўняй формай сувязі чалавека, культуры і прыроды ў пабудове ўстойлівага свету. Гэта такая матэрыя, якая нясе ў сабе фундаментальную дваістасць прыроды. У дадзеным артыкуле мы паспрабуем зразумець яго філасофію і разледзець асаблівае стаўленне чалавека да сусвету ў прасторы і часе.

## Жывая традыцыя мінуўшчыны

Яшчэ да пачатку 2000-х гадоў было не зусім зразумела, ці жыва яшчэ ў Беларусі традыцыйнае бортніцтва. Апошнія сістэматызаваныя сведчанні сягалі 1970–80 гадоў, калі тэма цікавіла навукоўцаў Акадэміі навук – тады бортніцтва разглядалася як традыцыйны промысел, элемент нематэрыяльнай культуры. Вынікам экспедыцый стала выданне кнігі Ўладзіміра Гуркова і Станіслава Цярохіна Занятак спрадвек высакародны (Мінск, 1987) [1]. Пасля 2010 года ў межах падрыхтоўкі матэрыялаў для надання бортніцтву статуса нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі былі праведзены новыя сістэматызаваныя экспедыцыі. Іх вынікі паказалі, што жывое традыцыйнае бортніцтва захавалася. Пры гэтым была выяўлена моцная лакальная супольнасць, дзе традыцыя не перарывалася на працягу больш за 4–5 стагоддзяў.

У паваенныя гады бортніцтва захавалася дзякуючы традыцыйнаму ладу жыцця пэўных вёсак. Промысел граў важную ролю для некаторых сем'яў, якія памяталі свайго дзеда або бацьку, якія ім займаліся. Сёння яшчэ можна знайсці ў лясах старыя калоды, а ў гаспадароў прылады, якімі карысталіся іх далёкія продкі, або нават яны самі, калі былі маладзейшымі.

Канешне, амаль паўсюль бортніцтва трансфармавалася, трапіўшы далёка ад леса на сядзібы. Паступова прыхільнікі бортніцтва пераходзілі да вулляў і пачыналі займацца звычайным пчалярствам. Толькі адзінкі займаліся бортніцтвам так, як іх навучылі бацькі і дзяды. Але пяцьдзесят гадоў таму амаль у кожнага гаспадара ў вёсцы было па пяць-шэсць калод, якія ў асноўным трымаліся пры сядзібе (у першыя гады калектывізацыі больш за дзесяць калод у гаспадара лічыліся прызнакам кулацтва, ад чаго сталі трымаць толькі каб хапіла на сям'ю), а агульная колькасць бортнікаў магла налічваць каля 10–15 тысяч чалавек (бортнікі былі ў большасці беларускіх вёсак).

Сёння ў Беларусі каля 10 000 калод, з якіх заселеныя пчоламі каля 1 500–2 000 (у розныя гады па-рознаму). Большая ж частка не мае гаспадароў і не абслугоўваецца на працягу ўжо больш як 20–30 гадоў. Так, па сведчанням лясгасаў Лельчыцкага раёна, з 2500–2800 наяўных калод заселены пчоламі ў розныя гады 40–65%. Калі казаць пра борці, іх колькасць складае не больш за 200. Пры гэтым заселенымі можна лічыць толькі 50–60. Мёдапрадукцыйнасць не перавышае 15–20 кг для калод-лежакоў і 10–15 кг для калод-стаякоў. У асобныя гады пчолы наносяць мёда наогул толькі на свае патрэбы, з невялікім лішкам для бортнікаў. Таму сёння прадукцыя бортніцтва спажываецца бортнікамі ў асноўным на свае патрэбы [2].

Па выніках пастаяннага маніторынгу на сённяшні дзень колькасць бортнікаў (не ўлічваючы членаў сям'і) па ўсёй Беларусі не перавышае 300, а колькасць спадчынных бортнікаў паступова скарачаецца праз натуральны сыход старых бортнікаў і адсутнасць жыццёвай неабходнасць да далейшага пашырэння бортніцтва, зніжэнне мёдапрадукцыйнасці тэрыторый і т. п.

Аналізуючы этнаграфічныя матэрыялы пачынаючы з сярэдзіны XIX стагоддзя, можна сказаць, што бортны промысел амаль не змяніўся: падыходы і практыкі засталіся тымі ж, прылады і прыстасаванні выкарыстоўваюцца яшчэ «прадзедаўскія», абрады, прыкметы і нематэрыяльны кантэкст бортніцтва засталіся амаль нязменнымі.

Асноўнай прыладай для пад'ёму з'яўляецца лезіва, асноўнай прыладай для выдзёўбвання калоды або борці – пешня, для збору мёду – лазбень (або кош), таксама дымар (для падкурвання пчол), маска, долата, свярдзёл ручны (або электрычны), сякерка. Сучаснай дадатковай прыладай стала бензапіла, якая



спрашчае чарнавую працу пры вырабе калоды, а таксама лябёдка, якая дазваляе падымаць цяжкія калоды на вышыню [3].

Вялікіх адрозненняў сярод калод на тэрыторыі Беларусі амаль не назіраецца. Асноўны матэрыял для іх вырабу – сасна, але існуе таксама шмат дубовых калод, пры гэтым дубовыя сустракаюцца як сучасныя (10–15 гадоў), так і старыя (да 300 гадоў, згодна інфармацыі, атрыманай ад саміх бортнікаў). Устаноўка калод адбываецца на вышыні ад 4 да 12 метраў. Фіксуецца калода пры дапамозе жалезных прутоў або вялікіх цвікоў, якія заганяюцца ў дрэва (калі няма прыдатнай галіны). Фіксацыя і спуск адбываюцца з дапамогай лязіва, якое сёння ў Беларусі сустракаецца ў двух відах: скуранае (з ласінай скуры) або вяровачнае (з пянькі або сінтэтычнага валакна). Пры гэтым канструкцыі драўляных частак амаль аднолькавыя.

Традыцыйнае бортніцтва на працягу некалькіх стагоддзяў выпрацоўвала і ўдасканальвала правілы і нормы паводзін, якія склаліся ў традыцыю. Пры гэтым кожны асобны бортнік валодае ўласнымі ведамі, практыкамі і падыходамі, якія часам могуць супярэчыць падыходам і практыкам іншага бортніка нават у базавых элементах, якія па-рознаму уплываюць на вынік. Напрыклад, кожны бортнік мае свае рэцэпты і падыходы ў прывабліванні роя, часам яны захоўваюцца таемна ад іншых бортнікаў.

Таксама праца кожнага асобнага бортніка можа адрозніваецца, бо кожны пераймае традыцыю і найлепшыя практыкі сваёй сям'і. І ўсё ж бортнікі сёння – гэта супольнасць прафесіяналаў сваёй галіны, якія гавораць на адной прафесійнай мове і добра разумеюць адзін аднаго.

Праца бортніка носіць цыклічны характар і амаль не адрозніваецца з года ў год. Лясное бортніцтва мае ўласны акрэслены каляндар, што цалкам адпавядае традыцыйнаму ўспрыняццю часа і гадавога цыкла. Гэты каляндар цалкам арыентаваны на пчол. Працяглы час выканання адной і той жа працы падвышае якасць і хуткасць у будучым, а таксама дапамагае назапасіць веды ад непасрэднага назірання за пчоламі, паводзінамі іншых насякомых, раслін, жывёл і птушак.

Бортніцтву вучацца змалку, дапамагаючы дарослым і назіраючы за працай бортніка ў лесе. Адзін бортнік працаваць не можа, у яго павінны быць памочнікі, якія знізу дапамагаюць у чарнавой працы. Такімі памочнікамі з'яўляюцца сямейнікі (гэта ў большай ступені тычыцца хлапцоў), якія паступова засвойваюць сакрэты вырабу калод, вучацца тапіць воск, засвойваюць правілы паводзінаў у лесе, назіраюць за пчоламі і слухаюць аповеды старэйшых. Калі ўзрост бортніка не дазваляе ўзлезці на дрэва, ён саступае месца маладому пераемніку традыцыі і ўжо сам пачынае выконваць функцыі памочніка і настаўніка – такім чынам промысел перадаецца ад пакалення ў пакаленне.

## Асноўныя элементы бортніцтва ды іх узаемасувязі

Бортніцтва – частка сацыяльнага і эканамічнага боку існавання грамадства, неземляробчая традыцыя, своеасаблівы прынцып кіравання «жывымі» рэсурсамі (або прынцып суіснавання розных па функцыях элементаў разам). Сёння гэта адасобленая форма культурнага пчалярства, новая канцэпцыя развіцця промысла і творчай дзейнасці, што прадугледжвае адказнае стаўленне да навакольнага асяроддзя і стварэнне новай школы выхавання асобы-чалавека.

У сувязі з тым, што бортніцтва судатыкаецца з самымі рознымі элементамі сучаснага свету, існаванне канфліктаў цалкам натуральна, а іх вырашэнне адбываецца ў супольнай працы і дыялогу. Давайце разгледзім яго асноўныя элементы.

**Лес і дрэва**. У старажытнасці лес – неад'емная частка культурнага ландшафта і традыцыйнай культуры, ён забяспечвае і вытворчымі матэрыяламі, і прадуктамі харчавання, стварае ўмовы ўстойлівага існавання. Паступова развіваюцца традыцыйныя формы лесакарыстання. Для бортніцтва лес – гэта галоўны актыў, натуральныя ўмовы існавання пчалы і база развіцця промысла, якую трэба захоўваць на будучыню (бо ад гэтага залежыць сам промысел) і за які нясецца адказнасць.

Напрыклад, бортнік выбірае самае «крывое» тоўстае дрэва, пажадана трухлявае ўсярэдзіне. Куды яно годнае? Толькі на дровы. Але калі паглядзець з іншага боку, такое дрэва змагло праіснаваць у лесе, перажыць самыя розныя хваробы і экалагічныя змены, і яго ген больш трывалы, насенне ад яго больш надзейнае. У такім дрэве (без яго пашкоджання) робіцца борць (штучнае дупло). Калі дрэва ўсё ж засыхае, яго выкарыстоўваць у якасці вулляў-калод. Таксама бортнік даглядае не толькі пчол, але і дрэва, ў якім яны жывуць, а яшчэ і сам лес. Бортнік ніколі не зробіць шкоду ў лесе, ён ставіцца да яго па-гаспадарску, бо там стаяць яго вуллі-калоды ці борці [4].

Сёння узнаўленне лясных рэсурсаў разумеецца як своеасаблівая «сельская гаспадарка»: ствараецца не лес, а «сасновыя палі». Для бортніцтва гэта непрымальна з пункту гледжання агульнага разумення лесу. Лес – гэта не колькасць дрэў на 1 га плошчы, а шчыльнасць і якасць узаемасувязей на 1 кв. м., упа-



радкаваная натуральным чынам сістэма. Не дзіўна, што бортнікі часта працуюць леснікамі. Яны звязаны з лесам не проста звычайнымі стасункамі і дзейнасцю, але кажуць, што «хварэюць лясной хваробай».

Так склалася гістарычна, што займацца бортніцтвам было выгадней, чым займацца лесам. Таму сёння разуменне бортнікаў выходзіць зусім на іншы ўзровень і вызначаецца планаваннем на 100 і больш гадоў (што было звычайным і ў старажытнасці, а сёння з'яўляецца ў еўрапейскіх краінах інавацыйным прынцыпам планавання развіцця лясной гаспадаркі).

**Пчала.** У старажытныя часы пчала – сакральная істота, неаддзельная частка традыцыйнага ладу і культуры, аб'ект пашаны, крыніца багацця і сродак плацяжу, непрыручаная істота ў гаспадарчай справе і неад'емная частка прыроднай прасторы. У новы час для бортніцтва пчала – гэта аб'ект адказнасці і прафесійнай будучыні, аб'ект апекі, догляду і аховы, частка складанага прыроднага свету. Пчалу нельга крыўдзіць. У культурным плане пчала настолькі «святая», што нават і самому крыўдзіцца на яе нельга. Сучаснаму чалавеку гэта складана зразумець, але для бортнікаў гэта натуральна і выконваецца безапеляцыйна [2].

Парадаксальна, але не гледзячы на тое, што пчалярства і бортніцтва звязаныя з адным і тым жа, паміж імі існуе хоць і не бездань, але вялікая адлеглась – гэта розныя сістэмы стасункаў з пчалой. Розніца палягае нават у розных локусах існавання: пчалярства – сельская гаспадарка, бортніцтва – лясная. Нават за часамі Статутаў ВКЛ прасочваецца супрацьстаянне лясной і сельскагаспадарчай дзейнасці чалавека. Сёння бортнік кажа, што займаецца пчоламі ў лесе і ніяк па-іншаму. Калі пчалярства існуе ў рамках «прадукта-арыентаванасці», то бортніцтва – «пчала-арыентаванасці». Іншымі словамі, калі ў бортніцтве ўсё круціцца вакол пчалы, то ў пчалярстве – вакол прадукцыйнасці, выгады і іншага.



Рыштунак бортніка

Яшчэ са старажытных часоў бортніцтва выпрацавала розныя па свайму выкананню, але падобныя па сутнасці «лепшыя практыкі» стасункаў з пчалой, якія амаль цалкам выключалі ўплыў на натуральныя прыродныя працэсы. Гэта пацвярджаецца апытаннем бортнікаў рознага ўзросту, з якога вынікае, што бортнікі прытрымліваюцца максімальнай натуральнасці адносін з прыродай. Як кажуць бортнікі, пчала сама знаходзіць борць, селіцца, жыве («мы не ўмешваемся ў яе жыццё»). Сёння бортнік не засяляе пчол штучна, а толькі прываблівае іх у новае жытло (тое ж самае можна казаць і пра старажытныя часы). Ён кажа: «Мая справа зрабіць вулей, павесіць яго, затварыць, а Бог будзе бачыць і пусціць туды пчалу». Гэта адпавядае перадавому прынцыпу «натуральнага пчалярства».

У апошнія гады бортнікі заўважылі павышэнне летняй тэмпературы і таму пачалі вешаць калоды-вуллі глыбей у лес (а раней наадварот – іх вешалі на ўскрайку леса). Нават лячэнне пчол сучаснымі сродкамі выклікае неадназначную рэакцыю аж да поўнага непрымання.

**Бортнік**. У старажытныя часы бортнік меў высокі статус сярод супольнасці і лічыўся выведчыкам новых земляў і навакольнага свету, вынаходнікам падыходаў да прыроды. Часам бортніка лічылі знахарам або чараўніком, і канешне ж, бортнік быў адным з першых прадпрымальнікаў старажытнасці (як і купцы). Сёння бортнік – апякун пчалы і лясной прасторы, носьбіт традыцый і звычаёвага права, асоба, адказная за сябе, сям'ю і родзічаў, патрыёт сваёй радзімы, які таксама мае рысы ляснога рэйнджара і ўніверсальнага майстра. Прафесійная супольнасць бортнікаў практычна ў нязменным выглядзе данесла да нас той самы этычны стрыжань, які мы сёння яшчэ можам адчуць.

Калі раней бортніцтва мела большае значэнне, было часткай спажывецкай эканомікі, то сёння традыцыйнае бортніцтва са сваімі абрадамі, звычаёвым правам, падыходамі і практыкамі сцвярджае іншую канцэпцыю. Яно абмяжоўвае спажыванне, бо сфакусавана на ўстойлівым развіцці ўсёй сістэмы (наваколля). Калі працей, бортнік лічыць раі і пчол, а не кілаграмы і літры (хаця і гэта ёсць). Сёння прадукты бортніцтва з'яўляюцца вытворнымі ад творча-культурнага працэса.

### Сувязь бортніцтва з экалагічнымі, эканамічнымі, культурнымі і сацыяльнымі працэсамі

Бортніцтва – складаная і адначасова простая творчая дзейнасць чалавека, якая нарадзілася ў натуральных умовах і ў большасці тычыцца не толькі беларускіх земляў. Гэты промысел патрабуе цішыні, якая і ёсць таямнічым бокам стасункаў чалавека з наваколлем, прыродай і грамадствам.

Канешне, бортніцтва – гэта дзейнасць, накіраваная на праактыўнае акультурванне прыроднай прасторы. Бортніцтва ўяўляецца такой нервовай сістэмай культуры, якая пабудавана на ўстойлівых сувязях з наваколлем. Яго «натуральны» абшар уключае лес і звязаныя з ім біятопы: луг і балоты.

У сённяшніх умовах бортніцтва цалкам захавала свой стрыжань і філасофію, бо бортнікі – людзі з пэўнай унутранай устаноўкай, якая транслюецца праз пакаленні ад старажытнасці да бягучага часу.

Промысел цалкам залежыць ад людзей, якія хоць і транслююць старую «дзядоўскую» навуку, але разам з тым і самі адаптуюцца да сучасных умоў. Гістарычна яны належалі да розных сацыяльных груп: гэта і частка вясковай грамады, і прадстаўнікі сакральнага свету. Гэта людзі, якія знаходзяцца асобна ад грамады, але разам з тым з'яўляюцца яе ўкаранёнай часткай, бо да іх звярталіся за парадамі ды дапамогай. У сённяшні час бортнікі захавалі гэтую дваістую прыроду: бортнік адначасова і скрытны, і гасцінны чалавек. Промысел патрабуе ўдзелу ўсёй сям'і. Нават сёння да бацькі-бортніка прыязджаюць сыны рабіць агульную справу.

У гістарычнай перспектыве бортніцтва ўвесь час эвалюцыянавала. Доўгі час промысел адносіўся хутчэй да збіральніцтва, меў сакральны статус, вытворным ад чаго стала стварэнне своеасаблівай абрадавай традыцыйнай матэрыі. У пэўны перыяд бортніцтва пачынае пераходзіць у спажывецкую форму гаспадарання, яно дасягае вышэйшай ступені развіцця, становіцца неад'емнай часткай рэгіянальнай эканомікі.

Калі мы кажам пра сучаснае бортніцтва, адразу трэба выключыць спажывецкі падыход да прыроды. Сёння бортнікі не адаптуюць навакольны свет пад свае патрэбы. Наадварот, гэта яны адаптуюцца і прыглядаюцца да кожнай сувязі з наваколлем. Бортніцтва не можа існаваць без устойлівага наваколля, прасякнутага калектыўнай памяццю людзей і доўгатэрміновым назіраннем за зменамі. Гэта азначае, што яно не можа быць нейкай атракцыяй або закасцянелым рытуалам.

Самі бортнікі ў гэтым працэсе займаюць важнае месца, што адлюстроўваецца ў такім панятку як «хазяяваць у лесе». Бортнік не можа рабіць што захоча. Яму трэба быць добрым кіраўніком сваёй вотчыны, тэрыторыі свайго ўплыву, каб біятопы існавалі і развіваліся з улікам доўгатэрміновага планавання на 100–150 год. Таму яны зацікаўлены ў захаванні верасовішчаў, а таксама займаюць праактыўную пазіцыю ў захаванні паўнавартасных лясоў [4].

Такім чынам, гэты промысел сваімі тэхналогіямі 1000-гадовай даўніны падтрымлівае біяразнастайнасць і ўстойлівае развіццё прыродных тэрыторый. Адпаведна, бортніцтва мае свой, пакуль не да канца зразумелы, механізм адаптацыі да наваколля і патрабаванняў асноўнай «віноўніцы» – пчалы. Пчала – не сродак здабычы тавара, а галоўны актыў, які мае найвялікшую вартасць.

## Пасляслоўе

У бортніцтве выкарыстоўваюцца тыя ж самыя прылады і прыстасаванні, якія былі распрацаваны больш за 1000 гадоў таму; захоўваюцца даўнія практыкі і падыходы ў адносінах да прыроды і ўсяго жывёльнага свету. І ўсё ж лясны бортны промысел у Беларусі не захоўваецца ў закансерваваным стане – ён адчувае на сабе ўплыў сучаснай цывілізацыі. У сённяшніх умовах бортны промысел адаптуецца і прапануе новыя падыходы, новую філасофскую парадыгму для пабудовы ўстойлівых адносін чалавека і прыроды. Хоць ён і «стары», а ўсё ж можа быць сучасным, бо ўсё крыецца ў традыцыйным падыходзе: «Старыны не рушыць, навіны не ўводзіць». Гэта прынцып пераемнасціназіранняў і найлепшых практык.

Калі казаць сучаснай мовай, то бортніцтва – гэта цалкам «eco-friendly»-занятак, які не патрабуе змяняць прастору пад сябе, а, наадварот, сам адаптуецца пад новыя ўмовы. Безумоўна, ён вельмі залежыць ад стану лясных і балотных біятопаў і найбольш ад прадукцыйнасці расліннага свету. Гэты промысел цалкам залежыць ад прыродных працэсаў.

## Выкарыстаная літаратура


[1] Гурков, В. С., Терёхин, С. Ф. Занятие издревле благородное. Минск: Полымя, 1987. 134 с.

[2] Гамзовіч, Р. С., Восіпаў, І. Д., Анцух Л. Ф. Бортніцтва – сувязь часоў. Мінск: Чатыры чвэрці, 2020. 252 с.

[3] Гамзовіч, Р. С., Восіпаў, І. Д. Лясное бортніцтва Беларусі. Мінск: Беларусь, 2022. 72 с.

[4] Восіпаў, І. Д. Найлепшыя ўстойлівыя практыкі бортніцтва і падыходы захавання традыцыйнага промысла // Сохранение и рациональное использование диких и одомашненных опылителей: сборник статей I Международной научно-практической конференции, 5–7 декабря 2018 г., Минск / рецензент : О. И. Бородин. – Минск: ГНПО «НПЦ НАН Беларуси по биоресурсам», 2018. С. 18–63.